МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ТРУДЫ

## МОЛОДЫХ СПЕЦИАЛИСТОВ ПОЛОЦКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

Основан в 2004 г.

Выпуск 6

### ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ

**Литературоведение и культурология**
**Лингвистика, иностранные языки**
**Философия и социология**
**История**

Новополоцк

2004

УДК 27(476)

# УНІЯЦТВА НА БЕЛАРУСІ: ВЫПАДКОВАСЦЬ, ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ, АЛЬТЭРНАТЫВА?

***В.У. ЧАРАЎКО***
***Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. В.І. ШАЙКОЎ***

*У артыкуле зроблена спроба прааналізаваць дауніяцкую канфесійную гісторыю Вялікага княства Літоўскага і даць яе перыядызацыю. Рэлігійная гісторыя Вялікага княства Літоўскага разглядаецца як узаемадзеянне верацярпімасці і уніяцкай ідэі – двух аднолькава магчымых шляхоў развіцця.*

Працэс павелічэння колькасці вернікаў, які адбываецца зараз на Беларусі, абудзіў цікавасць да рэлігійнай гісторыі. Насельніцтва беларускіх зямель здаўна з'яўлялася шматканфесійным. Пытанне аб тым, чым была на Беларусі уніяцкая царква – выпадковасцю, заканамернасцю ці альтэрнатывай – складанае і супярэчлівае.

На сёняшні дзень можна вылучыць тры асноўныя падыходы да гэтай праблемы. У дарэвалюцыйнай расійскай і савецкай гістарыяграфіі пануючай з'яўлялася думка аб выпадковасці ўзнікнення уніяцкай царквы [1, 2]. Унія 1596 года падавалася выключна як змова Ватыкана са жменькай праваслаўных іерархаў-рэнегатаў. Пры гэтым недаацэньваліся культурныя сувязі Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) з Захадам. Належнай увагі не надавалася гісторыі уніяцкай ідэі ў ВКЛ.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі распаўсюджана меркаванне аб заканамернасці Брэсцкай уніі, прычым ідэя яе ажыццяўлення нібыта «выйшла з беларуска-ўкраінскіх патрыятычных колаў» [3, с. 68]. Выканаўцы уніі нярэдка празмерна ідэалізуюцца, а роля Ватыкана ў заключэнні саюза 1596 года памяньшаецца [3, с. 64, 66 – 67, 70; 4, с. 418].

Аўтар трэцяга падыхода, С.А. Падокшын, лічыць унію альтэрнатывай верацярпімасці [5, с. 37 – 39]. Дауніяцкую канфесійную гісторыю ВКЛ у такім выпадку можна разглядаць як узаемадзеянне верацярпімасці і уніяцкай ідэі.

Мэтазгодным уяўляецца прааналізаваць рэлігійную гісторыю Княства да 1596 года і вылучыць асноўныя яе перыяды.

Геапалітычнае становішча ВКЛ шмат у чым прадвызначыла асаблівасці яго развіцця [4, с. 390]. На ўсходзе ад Вялікага княства замацавалася праваслаўе. Улічваючы спецыфіку сярэднявечча, яно стала дзяржаўнай ідэалогіяй, падмацоўвала і асвячала свецкую ўладу. На захадзе аналагічную ролю выконвала замацаваўшаеся там каталіцтва.

З самага пачатку ВКЛ было шматканфесійнай дзяржавай, бо ў ім побач пражывалі язычнікі і праваслаўныя [4, с. 391]. Неабходны быў мір паміж імі – інакш дзяржава проста не змагла б існаваць, тым больш на пачатковым этапе. Разумеючы гэта, вялікія князі прытрымліваліся верацярпімасці, якая нарэшце была ўзведзена Гедымінам у статус дзяржаўнай палітыкі [6, с. 153]. Гэта дае падставу вызначыць пачатак **перыяда «паганскай талерантнасці»**. Паганскай – бо яна вынікала з традыцый язычніцкай верацярпімасці.

Вялікаму княству Літоўскаму неабходна была адзіная рэлігія ў якасці дзяржаўнай ідэалогіі. Паколькі паганства не адпавядала актуальным патрэбам ВКЛ, такой рэлігіяй мусіла стаць праваслаўе. Тым больш, што актыўная ўсходняя палітыка Вялікага княства прыводзіла да ўзрастання ў ім долі славянскіх, праваслаўных зямель. Улічваючы гэта, Альгерд спрыяў хрысціянізацыі паганскага насельніцтва ВКЛ не парываючы, аднак, з талерантнасцю, каб не ўносіць раскол у грамадства. Рэальным падавалася канчатковае хрышчэнне ў праваслаўе і славянізацыя балтаў, што пераўтварыла б Княства ў этнічна і рэлігійна маналітную дзяржаву [4, с. 392]. Праваслаўе стала б дзяржаўнай рэлігіяй, а ўлічваючы спецыфіку сярэднявечча – і дзяржаўнай ідэалогіяй ВКЛ.

Перад наступнікам Альгерда Ягайлам паўстала неабходнасць заключэння саюза або з Масквой, або з Кракавам. Больш карысці, здавалася, мог прынесці другі варыянт. Таму ў 1385 годзе была заключана Крэўская унія [4, с. 224 – 225]. Перад дзяржаўнай ідэалогіяй ВКЛ паўстала задача не толькі кансалідаваць насельніцтва ўнутры Княства, але і падмацаваць саюз з Польшчай. Праваслаўе ў такой якасці не падыходзіла. Заставалася каталіцтва, якое павінна было стаць дзяржаўнай рэлігіяй Вялікага княства. Касцёл і каталіцкая феадальная знаць у ВКЛ атрымалі льготы, праводзілася акаталічванне насельніцтва [6, с. 83, 153]. Пачаўся **перыяд рэлігійнага радыкалізму**.

Наданне прывілеяў каталіцкай меншасці ўсхвалявала праваслаўную большасць феадалаў ВКЛ, якая небеспадстаўна ўбачыла ў гэтым імкненне Польшчы падпарадкаваць Княства. Праваслаўныя феадалы не змірыліся з пракаталіцкай палітыкай Ягайлы. Барацьбу за дзяржаўную незалежнасць ВКЛ узначаліў Вітаўт. Калі ён у 1392 годзе прыйшоў да ўлады, можна было чакаць змены канфесійнай палітыкі. Гэтага не адбылося. Знешнепалітычныя абставіны не дазвалялі разарваць Крэўскае пагадненне. У 1396 годзе па ініцыятыве Ягайлы абмяркоўвалася магчымасць заключэння уніі паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі. Унія давала яму ідэалагічную базу (адзіную рэлігію) для аб'яднання ВКЛ і Польшчы. Але развіцця гэта ідэя на той час не атрымала [5, с. 26; 7, с. 223 – 224; 8, с. 108 – 109].

У 1418 годзе зноў адбылася спроба ажыццяўлення уніі, на гэты раз па ініцыятыве Вітаўта, які бачыў у ёй сродак кансалідацыі грамадства ВКЛ [6, с. 93]. Кіраўнік спецыяльна створанай Літоўскай мітраполіі Грыгорый Цамблак накіраваўся на Канстанцкі сабор. Прапанаваны ім план аб'яднання праваслаўя і каталіцтва не задаволіў ні папства, ні большасць праваслаўных іерархаў. Уніі не адбылося [3, с. 19 – 21; 5, с. 11, 28; 6, с. 93].

Пасля смерці Вітаўта Вялікім князем стаў Свідрыгайла – выразнік інтарэсаў праваслаўнай знаці [6, с. 96]. У выніку змовы каталіцкай арыстакратыі ён страціў пасад. Спрабуючы вярнуць яго, эксманарх марна спрабаваў ажыццявіць уніяцкую ідэю. Новы гаспадар Жыгімонт Кейстутавіч прыняў пэўныя меры па ўраўнаванню ў правах католікаў і праваслаўных. За сваю непаслядоўную дзяржаўную палітыку ён паплаціўся жыццём [6, с. 96 – 100]. Грамадская нестабільнасць захавалася.

Рэлігійны радыкалізм паказаў сваю небяспеку як у каталіцкім, так і ў праваслаўным выкананнях. Таму манархі, якія кіравалі пасля Жыгімонта Кейстутавіча, вялі больш гнуткую, кампрамісную палітыку. Праваслаўныя феадалы былі часткова ўраўнаваны ў правах з каталіцкімі. Нягледзячы на некалькі безвыніковых спроб рэалізацыі уніі пры Казіміры і Аляксандры Казіміравічы, магістральным застаўся накірунак верацярпімасці. Ды і навошта была унія? Падчас войнаў з праваслаўнай Маскоўскай дзяржавай праваслаўная знаць ВКЛ захоўвала вернасць католіку-гаспадару. Лаяльнасць яму ў час падобных канфліктаў выказвалі самі праваслаўныя іерархі. У той час, як спробы рэалізацыі уніі абвастралі этнарэлігійныя супярэчнасці і давалі ўзмацняўшайся Маскве падставу для ўмяшання ва ўнутраныя справы сваёй заходняй суседкі – «абарону» праваслаўных ВКЛ [5, с. 29 – 30, 92; 6, с. 114, 160 – 161; 9, с. 41 – 43]. Праўленне Казіміра, Аляксандра і Жыгімонта I можна вызначыць як **перыяд біканфесійна-парытэтнай талерантнасці**. Біканфесійна-парытэтнай – бо верацярпімасць грунтавалася на прызнанні роўнымі дзвюх асноўных плыняў хрысціянства: праваслаўя і каталіцтва.

Пры Жыгімонце II Аўгусце прынцып рэлігійнай талерантнасці стаў дамінуючым [5, с. 38]. Гэта было выклікана з'яўленнем у ВКЛ пратэстантызму – трэцяй уплывовай хрысціянскай плыні (дакладней, групы плыняў). Найбольшае пашырэнне на беларускіх землях набыў кальвінізм [6, с. 224]. Надышоў **перыяд поліканфесійнай талерантнасці**. Ён быў нядоўгім.

З пачаткам контррэфармацыі звязаны паступовы адыход ад верацярпімасці. Намаганнямі каталіцкіх іерархаў і ўрада Рэчы Паспалітай у дзяржаве разбуралася поліканфесійная талерантная мадэль. У якасці замены ёй прапаноўвалася унія, якую папства, урады ВКЛ і Рэчы Паспалітай, праваслаўныя епіскапы разумелі кожны па-свойму і мелі наконт яе розныя планы. Інтарэсы бакоў супадалі на стадыі ажыццяўлення уніяцкай ідэі, таму бакі аб'ядналі свае намаганні. У ВКЛ папулярнасцю карысталася ідэя гуманістычна-рэнесанснай уніі [4, с. 417 – 418; 5, с. 11, 41]. Прапанаваны лакальны контррэфармацыйны варыянт з'яўляўся больш рэалістычным, але менш прыцягальным і папулярным. Таму, каб не выклікаць супрацьдзеяння, творцы уніі дзейнічалі сакрэтна. Вынікам стала Брэсцкая унія 1596 года, якая распачала ў ВКЛ **перыяд каталіцка-уніяцкага дамінавання**.

Відавочна, што ў перыяд да 1596 года ў ВКЛ адбывалася барацьба двух альтэрнатыўных курсаў канфесійнай дзяржаўнай палітыкі: верацярпімага і уніяцкага. Талерантнасць засведчыла сваю прагрэсіўнасць і перспектыўнасць. Уніяцкая ідэя разглядалася і прагназавалася ў якасці больш аптымальнай. Таму кіраўніцтва Рэчы Паспалітай і ВКЛ пайшло на заключэнне Брэсцкай уніі. З'яўленне уніяцкай царквы на Беларусі, такім чынам, не было выпадковым, але не з'яўлялася і адзіна магчымым варыянтам развіцця канфесійнай гісторыі ВКЛ. Узнікненне уніяцтва абумоўлена выбарам аднаго з двух магчымых шляхоў развіцця.

## ЛІТАРАТУРА


1. Карамзин Н.М. История государства Российского. – М.: Эксмо, 2003. – 1024 с.: ил.
2. Дмитрук К.Е. Униатские крестоносцы: вчера и сегодня. – М.: Политиздат, 1988. – 381с.: ил.
3. Марозава С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596 – 1839 гг.); Пад навук. рэд. У.М. Конана. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 352 с.
4. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да кан. XVIII ст.: Курс лекцый / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель, С.В. Марозава і інш. – Мн: РІВШ БДУ, 2000. – 656 с.
5. Падокшын С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз). – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2000. – 111 с.
6. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да кан. XVIII ст. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.: іл.
7. Ермаловіч М.І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. – 2-е выд. – Мн.: Беллітфонд, 2003. – 448 с.: іл.
8. Гісторыя Беларусі: Падруч.: У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, І.Л. Качалаў і інш.; Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Выш. шк., 2003. – 416 с.: іл.
9. З гісторыі уніяцтва на Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі) / С. Марозава, Т. Казакова, Ю. Бохан і інш.; Пад рэд. М.В. Біча, П.А. Лойкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 134 с.